**1 МАЯ**

# УНІВЕРСАЛЬНЫ РЭЦЭПТ ДАБРАБЫТУ І ЗГОДЫ

***Паважаныя суайчыннікі!***

*Ад усёй душы віншую вас са Святам працы.*

*Пакладзеная ў аснову жыцця беларускага народа мірная і стваральная праца з'яўляецца ўніверсальным рэцэптам дабрабыту і згоды. Толькі з апорай на ўласныя сілы і таленты мы пабудавалі незалежную і паспяховую дзяржаву.*

*У год 80-годдзя Вялікай Перамогі з асаблівай цеплынёй і ўдзячнасцю звяртаемся да ветэранаў вайны і працаўнікоў тылу, да ўсіх, хто аднаўляў краіну з руін. Дзякуючы вашым гераізму і самаахвярнасці сёння мы будуем канкурэнтную эканоміку, умацоўваем палітычную стабільнасць, у міры і гармоніі перадаём назапашаны досвед маладому пакаленню.*

*Поспехі ва ўсіх сферах — ад прамысловасці і адукацыі да сельскай гаспадаркі і медыцыны — гэта вынік штодзённых намаганняў і адданасці сваёй справе кожнага беларуса.*

*Шчыра ўдзячны вам за ўклад у працвітанне нашай Айчыны. Жадаю ўсім дабра і дастатку. Няхай жыццё будзе напоўнена натхненнем і новымі здзяйсненнямі.*

*Са Святам працы!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КРАСАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 83 (30471)

## Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у Міжнародным патрыятычным форуме Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня» ў Валгаградзе

# «ПРАЎДА АБ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ — НАШ ШЧЫТ»

У мерапрыемстве, прымеркаваным да 80-годдзя Вялікай Перамогі і накіраваным на абарону гістарычнай праўды, захаванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, узялі ўдзел звыш 500 удзельнікаў з 20 краін. Галоўнымі спікерамі на форуме былі Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Уладзімір ПУЦІН.

СТАР. 2–3



Найперш лідары ўсклалі кветкі ў гісторыка-мемарыяльным комплексе «Героям Сталінградскай бітвы» на Мамаевым кургане.

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «ПРАЎДА АБ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ — НАШ ШЧЫТ»

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

Вянкі ад кіраўнікоў дзяржаў былі ўскладзены ў Зале воінскай славы. Таксама Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін усклалі кветкі да магілы маршала Савецкага Саюза Васіля Чуйкова, легендарнага камандуючага 62-й арміяй, што праславілася гераічнай шасцімесячнай абаронай Сталінграда. Васіль Чуйкоў памёр у 1982 годзе і быў пахаваны на Мамаевым кургане каля падножжа манумента «Радзіма-маці кліча!», побач з воінамі сваёй арміі, якія загінулі ў Сталінградскай бітве.

Пасля наведвання гісторыка-мемарыяльнага комплексу кіраўнікі дзяржаў накіраваліся на пляцоўку міжнароднага форуму Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня».

## «МЫ ЗВЯРТАЕМСЯ ДА ГІСТОРЫІ, КАБ АБАРАНІЦЬ НЕ ТОЛЬКІ БУДУЧЫНЮ, А ЎЖО СУЧАСНАСЦЬ»

Падчас свайго выступлення Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што час і месца гэтай сустрэчы маюць сімвалічнае значэнне. «Мы сабраліся тут, у Сталінградзе, у горадзе, які стальной, непераадольнай крэпасцю стаў на шляху захопнікаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Тут пачаўся адлік часу, які набліжаў пераможны май. Менавіта тут, у гэтым гераічным горадзе савецкага народа, пачаўся карэнны пералом у гады вайны, і ў будучым годзе мы канчаткова зломім хрыбет фашысцкаму зверу на Курскай дузе. І ўжо гэта стала перамогай беспаваротнай, калі нічога нельга было змяніць, калі шлях быў толькі адзін — Берлін».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта сустрэча ў Валгаградзе — не толькі даніна агульнаму гераічнаму мінуламу.

**«Мы звяртаемся да гісторыі, каб абараніць не толькі будучыню, а ўжо сучаснасць, — сказаў ён. — Так сёння стаіць пытанне. Мы спадчыннікі вялікага пакалення — герояў-пераможцаў. І нам няма чаго саромецца і штосьці ўтойваць. Гэты статус шмат да чаго абавязвае, але і многіх раздражняе. Нам супрацьстаяць нашчадкі прыхільнікаў Трэцяга рэйха, якія прайгралі. Аб гэтым мы ўсё больш і больш кажам».**

Па словах Прэзідэнта, менавіта Сталінград прыняў беспрэцэдэнтны па моцы 200-дзённы ўдар. «Тысячы загінулых герояў. Кожны — ад генерала да салдата — разумеў, што тут вырашаецца лёс чалавецтва і ход сусветнай гісторыі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы толькі ўявіце: калі б фашысты перамаглі ў Сталінградзе, нам было б немагчыма выйграць гэту вайну. Самалёты стаяць, танкі не рухаюцца, аўтамабілі не перамяшчаюцца, матацыклы і іншае. У нас няма галоўнага рэсурсу — нафты, якую мы тады ў асноўным здабывалі на Каўказе. І не толькі гэтым каштоўны Сталінград. Далей адступаць было нельга. Не гаварылі б пра Курскую дугу. У далейшым вырашаўся б лёс Масквы. Таму тут усе сталі намертва».

Прэзідэнт адзначыў: тое, што месцам форуму вызначаны Валгаград, вельмі правільна. «Гэта дакладнае пападанне для таго, каб абмеркаваць тыя праблемы, якія перад намі стаяць, якія нам навязваюць гэтыя самыя нашчадкі, — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Таму на Волзе сталі да смерці. Як у Брэсцкай крэпасці».




## «МЫ ЎСЕ КЛАНЯЕМСЯ ГЕРОЯМ, ЯКІЯ ЗМАГЛІ ВЫТРЫМАЦЬ СМЯРОТНЫ ЎДАР»

Аляксандр Лукашэнка працытаваў камандуючага 62-й арміяй генерала Васіля Іванавіча Чуйкова: «Мы, жывыя ўдзельнікі баёў за Сталінград, сведчым, што тут нашы воіны не ведалі страху ў баі, не адступалі перад смерцю, вялі бітву з такой рашучасцю, што нават мёртвыя не выпускалі з рук зброю». «Паўтару: мёртвыя не выпускалі з рук зброю... — акцэнтаваў беларускі лідар. — Дадаць да гэтага няма чаго. Мы ўсе з вамі кланяемся героям, якія змаглі вытрымаць смяротны ўдар, устаць ва ўвесь рост і адкінуць азвярэлага ворага, пагнаўшы яго да Берліна».

Па словах Прэзідэнта, мы не забываемся пра дапамогу саюзнікаў. «Але давайце шчыра: саюзнікі далучыліся, калі наш салдат хрыбет зламаў фашысцкаму зверу», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

**Ён падкрэсліў, што тысячы ўраджэнцаў усяго Савецкага Саюза, у тым ліку і Беларусі, абаранялі Сталінград. «Назаву імёны толькі некаторых: гэта камандуючы Данскім фронтам, адзін з маршалаў Перамогі Канстанцін Ракасоўскі, — канкрэтызаваў ён. — Героі Савецкага Саюза: лётчыкі — Мікалай Карначонак, Іван Пстыга; танкісты — Іван Якубоўскі, Аляксандр Лізюкоў; артылерысты — Уладзімір Тарановіч, Ізраіль Бескін; пехацінцы — Уладзімір Марцінкевіч, Вікенцій Скрыганаў. Увайшоў у гісторыю абароны горада беларус Аляксей Вашчанка, які закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота. Яго імя носіць адна з вуліц цяперашняга горада Валгаграда».**

Прэзідэнт падзякаваў, што тут аб гэтым памятаюць. Ён канстатаваў: памяць аб шматлікіх героях-вызваліцелях, сярод якіх ёсць і беларусы, захоўвае Зала воінскай славы на Мамаевым кургане. «Гэта нашы агульныя героі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што і Курган Славы пад Мінскам захоўвае зямлю з розных куткоў Савецкага Саюза, дзе ішлі самыя жорсткія баі.

**«Мы беражом часцінку Сталінграда ў самым цэнтры нашай сталіцы, на плошчы Перамогі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Цагліны з легендарнага дома Паўлава закладзены ў падмурак аднаго з будынкаў па праспекце Незалежнасці. Гэта свяшчэнныя для нас рэліквіі. Усе беларусы аб тым ведаюць».**

Па словах кіраўніка дзяржавы, беларусы ведаюць і тое, што перамогу пад Сталінградам атрымаў увесь наш савецкі народ.

«Усе, хто працаваў на патрэбы Чырвонай Арміі ў глыбокім тыле, адцягваючы на сябе ўвагу ворага і падрываючы ваенны патэнцыял вермахта знутры, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта там, у тыле ворага, быў адкрыты сапраўдны другі фронт. Не амерыканцамі і французамі! І гэта быў адказ на жахлівыя злачынствы нацызму».

## «МЫ МАЎЧАЦЬ НЕ ПАВІННЫ!»

Прэзідэнт расказаў, што Генеральная пракуратура Беларусі ўжо некалькі гадоў расследуе жахлівыя факты генацыду беларускага народа. «Мы выкрываем новыя факты злачынстваў: тысячы зажыва спаленых і закатаваных жанчын, старых, дзяцей, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Нашы вучоныя, ваеннаслужачыя падымаюць з зямлі астанкі малых, якіх маці прыціснулі да грудзей. У кожнай яме — дзеці. Забівалі, знішчалі сем'ямі. Спосабы пакарання жахаюць. Людзей прымушалі самастойна ўкладвацца на трупы, каб змясціць у яму як мага больш цел. Закідвалі гранатамі, каб яшчэ лепш утрамбаваць. Уздымаем паказанні сведак аб тым, як успорвалі жываты цяжарным жанчынам, прыкладам разбівалі галовы грудным немаўлятам, закідвалі аднагадовых дзяцей у вокны падпаленых

хат, падкідвалі малых і лавілі іх на штыкі. На маці, якія бачылі гэта і вар'яцелі, ладзілі паляванне, як на звяроў».

Па словах беларускага лідара, раней гэтыя дакументы былі засакрэчаны.

**«Не прынята было ў савецкі час казаць пра тое, што асаблівую жорсткасць дэманстравалі літоўскія, латвійскія, украінскія нацысты, — растлумачыў прычыну Прэзідэнт. — А сёння ў прыбалтыйскіх краінах і Украіне моладзь махае сцягамі дывізій СС, ставяць помнікі фашысцкім катам. І ўсё гэта з маўклівай згоды астатняга Захаду. Але мы маўчаць не павінны! Мы для гэтага сёння з вамі сабраліся».**

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што заходнія «спецыялісты» па беларускай, савецкай гісторыі пішуць, што мы занадта пафасна расказваем пра сваіх герояў, перабольшваем маштабы іх подзвігу. «Нам намякаюць, што трэба было б і пра «дрэнных» сваіх гаварыць, і пра «добрых» немцаў не забывацца — вучаць нас з-за акіяна псеўдааб'ектыўнасці, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Паслы краін Еўрасаюза сёння сарамліва, без асвятлення ў сродках масавай інфармацыі ўскладаюць кветкі ў Хатыні, хаваюць твары ад камер журналістаў. Польшча праводзіць мерапрыемствы, прымеркаваныя да вызвалення Чырвонай Арміяй вязняў Асвенцыма, без нашага ўдзелу. У нямецкім СМІ паведамляюць аб тым, што гэты канцлагер вызвалілі амерыканскія войскі. Словам, робіцца ўсё, каб сцерці памяць аб Вялікай Перамозе, аб нашых пераможцах».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што падчас форуму ў Валгаградзе сабраліся людзі, якіх не трэба ні ў чым пераконваць. «Наша з Прэзідэнтам Расіі, Уладзімірам Уладзіміравічам, пакаленне вырасла, слухаючы аповеды франтавікоў (нашых бацькоў) і тых, хто выжываў у акупацыі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — З пакаленнем, якое нарадзілася і сталела ў 1990-я, пагадзіцеся, складаней. Светапогляд «дзяцей перабудовы» фарміраваўся ў самы пік рэваншысцкай прапаганды. Шмат было зроблена, каб дыскрэдытаваць Чырвоную Армію, партызанскі рух, рух Супраціўлення на нашай зямлі, абяліць нацысцкіх злачынцаў. Дастукаліся не да ўсіх. Але ў асобныя галовы іх ідэі праніклі».

І гэта, па словах беларускага лідара, для ўсіх з'яўляецца ўрокам.

**«Для абароны гістарычнай памяці трэба рабіць яшчэ больш, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Ніколі нельга расслабляцца. Ніякім пакаяннем верыць нельга. Толькі рэальным справам. І гэта вельмі актуальна.**

Не толькі для нас з Прэзідэнтам (Уладзімірам Пуціным. — **«Зв.»**) сёння, калі нам многае абяцаюць (можа, пакуль не ўсё ўсе ведаюць — хутка даведаецеся), а рабіць, як звычайна, як кажа Прэзідэнт Расіі, не будуць. Магу яго толькі працытаваць: «Падмануць у чарговы раз». Таму толькі справы, толькі факты. Вы — нам, мы — вам. Вы нас так навучылі».

Заканчэнне на стар. 4 ►



# «УСЕ НАШЫ РАШЭННІ НАКІРАВАНЫ НА АДЗІНСТВА НАШЫХ НАРОДАЎ»

## У Валгаградзе адбылася двухбаковая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў свайму расійскаму калегу за магчымасць наведаць Валгаград (Сталінград), дзе беларускі лідар быў і ў савецкія часы, і ўжо будучы Прэзідэнтам. «Уражальнае месца, без дрыжыкаў тут немагчыма, — кажучы аб Мамаевым кургане, адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Я сапраўды вельмі праніксяў у свой час. Я ўсё-такі гісторыю вывучаў, ведаю, як тут людзі змагаліся... Калі стаіш каля гэтага манумента — гэта грандыёзная рэч, не перадаць. Таму я вам удзячны, што, дзякуючы вашаму запрашэнню, я зноў тут, на нашай святой зямлі, дзе і беларусы, і рускія, і ўсе народы Савецкага Саюза насмерць стаялі».

### «МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ НАШЫ АДНОСІНЫ Ў АЙЧЫНЕ БЫЛІ ЯШЧЭ БОЛЬШ ШЧЫЛЬНЫЯ»

Прэзідэнт нагадаў: у Беларусі, акрамя шэсця «Бессмяротнага палка», што праводзіцца па ініцыятыве Расіі, у рамках якога ў якасці сімволікі выкарыстоўваецца георгіеўская стужка, наша моладзь раней ініцыявала штогадовую акцыю «Беларусь памятае». Абодва мерапрыемствы ладзяцца паралельна.

«Калі вы адкрывалі шэсце «Бессмяротны полк», мы ў Беларусі гэтым шляхам пайшлі, — канстатаваў беларускі лідар. — Але моладзь паралельна з георгіеўскімі стужкамі і шэсцем палка (ініцыявала акцыю. — **«Зв.»**) «Беларусь памятае». І ніхто не забараняе ні ў якім разе георгіеўскія стужкі, хоць я пацікавіўся гісторыяй. Раю: вось вазьміце, няхай вам дадуць гісторыкі ўсю інфармацыю пра георгіеўскую стужку. Мы гэта не адмаўляем. Хоць своеасаблівая ўсё ж гісторыя гэтай георгіеўскай стужкі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што нічога дрэннага не бачыць у дадзеным сімвале. «Хтосьці хоча георгіеўскую стужку, хтосьці хоча «Беларусь памятае» — гэтыя знакі (сімволіка акцыі. — **«Зв.»**) разам ідуць, — звярнуў увагу ён. — Ніхто там нічога не дзеліць. Ну, камусьці ж трэба пашумець».

Прэзідэнт Беларусі параіў расійскаму калегу не звяртаць увагі на асобныя негатыўныя выказванні наконт гэтага. «У нас ідэя абсалютна аднолькавая, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы нашы ідэі ведаеце, мы ведаем расійскія ідэі. Гэта адна Айчына, як я кажу, ад Брэста да Уладзівастока».

У сваю чаргу, Уладзімір Пуцін пагадзіўся, што сімвалы могуць быць крыху рознымі, але важна іншае — тое, што стаіць за гэтымі сімваламі.

«Сутнасць», — падтрымаў калегу Аляксандр Лукашэнка.

«За гэтымі сімваламі стаіць наша агульная гісторыя, наша сучаснасць і наша будучыня. А яна ў нас — агульная. Дзякуй вам вялікі за такую пазіцыю», — сказаў Уладзімір Пуцін.

**Беларускі лідар адзначыў: так адбылося, што Савецкі Саюз распаўся, утварыліся дзве суверэнныя дзяржавы. «І ўсе мы павінны зрабіць усё для таго, каб нашы адносіны ў Айчыне былі яшчэ больш шчыльныя, чым ва ўнітарнай дзяржаве, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І мы з вамі нямала ў гэтым зрабілі. Я ўпэўнены, нашы дзеці, іншыя пакаленні яшчэ ацэняць, што мы тут робім. Нам няпроста: і злева, і справа нас «бамбяць». Нашы ўсе рашэнні накіраваны на адзінства нашых народаў, што вельмі важна напярэдадні гэтай светлай даты (Дня Перамогі. — «Зв».)».**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, няхай ніхто не здзіўляецца, што два лідары часта сустракаюцца. «Мы ж ні ад кога не адпіхваемся, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.— Мы гатовы прымаць. Калі Эмамалі Шарыпавіч (Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон. — **«Зв.»**) пагадзіўся прыехаць да нас у вёску, калі мы ў сакавіку сустракаліся (размова аб нефармальнай гутарцы пасля мерапрыемстваў афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Расію. — **«Зв.»**), — з задавальненнем пасядзелі, паразмаўлялі. Агульныя пытанні. Прыязджайце — будзем разам размаўляць і будаваць нашы адносіны».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў свайму расійскаму калегу за запрашэнне прысутнічаць на парадзе на Краснай плошчы ў Маскве 9 Мая. «Мы не маглі не прыехаць, — сказаў ён. — Вы ведаеце, што мы едзем спачатку на Красную плошчу, потым праводзім парад у сябе ў Беларусі. Нічога, што мы, дзве дзяржавы, два Прэзідэнты, прыхільныя гэтаму. Нам не цесна, нам не сумна, мы робім сваю справу. Калі ласка, хто хоча — няхай далучаецца».

Беларускі лідар пагадзіўся з Уладзімірам Пуціным, які сказаў, што паміж Прэзідэнтамі склалася добрая традыцыя, каб і падагнаць нашы ўрады, і задаць пэўны трэнд у нашых адносінах, і вырашыць пэўныя пытанні, якія не вырашаюцца ўрадамі. «Мы рэгулярна сустракаемся, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Удзячны вам за тое, што мы часта стэлефаноўваемся, абмяркоўваючы тэрміновыя пытанні. У нас сапраўды агульнае разуменне ўсяго працэсу развіцця, парадак міжнародных адносін у нас абсалютна падобны. Тут няма чаго казаць, мы гэта не хаваем, не круцім там, не верцім».

Заканчэнне на стар. 4 ►

# «УСЕ НАШЫ РАШЭННІ НАКІРАВАНЫ НА АДЗІНСТВА НАШЫХ НАРОДАЎ»

## «ГЭТА ВЕЛЬМІ ВАЖНА ПЕРШ ЗА ЎСЁ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ, ЛАГІСТЫКІ»

Прэзідэнт Расіі выказаў удзячнасць беларускаму калегу за прыезд на свяшчэнную Сталінградскую зямлю напярэдадні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Вельмі разлічваем бачыць вас у Маскве ў дзень асноўных урачыстасцяў 9 Мая, — сказаў расійскі лідар. — Ведаю, што вы прынялі рашэнне аб тым, каб ваш парадны разлік таксама прайшоў па Краснай плошчы. Дзякуй вам вялікі».

**Уладзімір Пуцін звярнуў увагу на тое, што ў двух лідараў ёсць магчымасць і ў фармальнай, і ў нефармальнай абстаноўцы пагаварыць па бягучых справах. «Іх у нас вельмі шмат, — адзначыў Прэзідэнт Расіі. — Дастаткова сказаць, што толькі ў сферы гандлёва-эканамічных сувязяў у нас вынікі проста выдатныя — звыш 50 млрд долараў гандлёвы абарот. Па вашых статданых, нават крыху больш».**

Уладзімір Пуцін заявіў аб неабходнасці абмеркаваць далейшае развіццё і пашырэнне прамысловай кааперацыі паміж дзвюма краінамі, у тым ліку за кошт сумеснай работы ў сферы авіябудавання, стварэння беспілотных лятальных апаратаў. «Хачу вам расказаць, якія ёсць прапановы. Мы гатовы ўжо закласці завод разам з вашымі спецыялістамі і адпаведную лабараторыю па беспілотах. Гэта вельмі важна перш за ўсё для эканомікі, лагістыкі. У нас ёсць дамоўленасці па авіябудаванні. Вам удалося захаваць частку авіяцыйнай прамысловасці. Тут ёсць таксама над чым працаваць. І невялікі самалёцік, і кааперацыя па сярэднемагістральных самалётах. Таксама па іншых кірунках пагаворым. Урады працуюць над гэтымі пытаннямі ўвесь час. Мы з вамі ў курсе, пра што калегі дамаўляюцца», — звярнуў увагу расійскі лідар.

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3)*

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта Беларусі.**

# «ПРАЎДА АБ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ — НАШ ШЧЫТ»

## «РАЗАМ МЫ — НАЙМАГУТНЕЙШАЯ СІЛА»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на важнасць лічбаў і фактаў. Але яшчэ больш важным, па яго словах, з'яўляюцца эмоцыі і сэнсы, кадры ваеннай хронікі — без цэнзуры. «Я, можа, скажу непапулярную рэч, але не час разважаць аб траўміраванай псіхіцы дзяцей, якія могуць убачыць гэтыя страшныя здымкі і відэа, што мы часта дэманструем, — лічыць Прэзідэнт. — Малайцы расіяне, мы гэта транслюем у Беларусі ў поўным аб'ёме, вы гэта паказваеце больш. У вас такіх магчымасцяў больш, але і нам трэба ў гэтым кірунку больш працаваць у архівах. Правільна робіце. Не трэба нам дрыжаць, што хтосьці гэта ўбачыць меншыбольшы. А як ім растлумачыць, чаму мы сёння адчайна змагаемся за гэту гістарычную памяць? Яны павінны бачыць праўду і рабіць адпаведныя высновы з нашай дапамогай. Як яны павінны зразумець, чаму нашы воіны, партызаны і падпольшчыкі, не задумваючыся, аддавалі свае жыцці за краіну? І нам складаней, чым пасляваеннаму пакаленню, паколькі больш за 80 гадоў мінула. Ужо няма нерва той эпохі...»

Па словах Прэзідэнта, у Беларусі актыўна прасоўваецца ў грамадстве разуменне таго, што памяць аб Вялікай Перамозе — гэта частка нацыянальнай ідэі.

**«Мы стараемся рабіць усё, каб нашы дзеці памяталі: гэтай Перамогай мы моцна звязаны з рускім народам, усімі народамі былога Савецкага Саюза, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам гэта нельга страціць, бо разам мы — не проста магутная, мы наймагутнейшая сіла. І нас ніколі не пераможаш! Вялікая Перамога святая.**

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1–3)*



**Праўда аб Вялікай Айчыннай вайне — наш шчыт. Трымаць яго ў сваіх руках — вялікі гонар і адказнасць. І нам трэба пра гэта памятаць».**

## «ЯК ТОЛЬКІ ЗАБУДЗЕМ ШЛЯХ ДА ХАТЫНІ, СТАЛІНГРАДА, БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ, УСЁ ВЕРНЕЦЦА ЗНОЎ»

У заключэнне Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму ў Беларусі, у цэлым на прасторы былога Савецкага Саюза, так змагаюцца за захаванне гістарычнай праўды і памяці. Ён удакладніў, што гэта пытанне нам задаюць і звонку.

«Я хачу, каб там (на Захадзе. — **«Зв.»**) пачулі, чаму мы так учапіліся за гэту памяць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Па-першае, гэтай памяццю мы павінны ганарыцца. Яны нам зайздросцяць. Дзякуй богу, што ў нас ёсць пакаленне пераможцаў, якім мы ганарымся. Таму мы за гэта і чапляемся. Па-другое, таму, што пачалася новая, чарговая вайна — яна пачалася. Але не мы яе пачыналі. Наступны этап гэтай вайны будзе вайна гарачая — сусветная вайна са зброяй у руках. Мы гэтага не хочам. Сёння ідзе этап вайны ў сродках масавай інфармацыі. Дзякуй богу, пакуль мы дыскуцыруем, змагаемся на гэтых пляцоўках. Ідзе вайна за розумы людзей, і за галовы. Сучасная гарачая вайна немагчымая без гэтай падрыхтоўкі. Гэта падрыхтоўка пачалася. Таму мы так учапіліся за гэту гістарычную памяць, каб паказаць цяперашнім, будучым пакаленням, нашым дзецям, што калі раптам нам трэба змагацца за сваю зямлю, за свае сем'і, за сваіх дзяцей так, як змагаліся яны, не шкадуючы ні жыцця, нічога, што ёсць... Вось чаму мы гаворым аб гістарычнай памяці, а не таму, што нам хочацца гаварыць».

Прэзідэнт канстатаваў: у грамадстве няма людзей, якія думаюць, што «пагаварылі — і ўсё на гэтым», «да помніка схадзілі — сёння назад прыйшлі».

**«Не! Як толькі забудзем шлях да Хатыні, Сталінграда, Брэсцкай крэпасці, усё вернецца зноў, імгненна, нават не заўважым, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Таму мы павінны, зубамі ўчапіўшыся, трымацца за гэту гістарычную памяць».**

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**
**Фота president.gov.by, БелТА.**

# ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ НАЦЫЗМ НЕ АДРАДЗІЎСЯ

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, выступаючы на пленарным пасяджэнні міжнароднага форуму ў Валгаградзе, сказаў: «Усе мы добра ведаем, якую бязмерна дарагую цану заплацілі нашы народы за перамогу над нацызмам, якія каласальныя ахвяры былі прынесены дзеля гэтага. І няма сумненняў, што і ў Расіі, і ў Беларусі, ды і ў іншых краінах будуць заўсёды памятаць урокі гэтай вайны. Галоўны з іх відавочны — трэба зрабіць усё, каб супрацьстаяць адраджэнню нацызму, распаўсюджванню разбуральных ідэалогій русафобіі, антысемітызму, любых форм расізму, нацыянальнай або рэлігійнай нецярпімасці. Так званай выключнасці». Расійскі лідар падкрэсліў, што за ўсім гэтым хаваюцца прэтэнзіі на сусветнае панаванне, спробы ціску або ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў.

«І, вядома, важна разам фарміраваць больш справядлівы шматпалярны светапарадак на прынцыпах павагі інтарэсаў адно аднаго і права кожнага на ўласную мадэль развіцця. Менавіта на гэтай аснове Расія развівае партнёрства з Беларуссю і з усімі іншымі краінамі — удзельнікамі форуму», — заявіў Уладзімір Пуцін. Ён таксама выказаў перакананне, што сусветнай супольнасці неабходна разам стварыць новую архітэктуру роўнай і непадзельнай бяспекі, якая б надзейна абараняла ўсе дзяржавы не на шкоду інтарэсам іншых. «Асабліва актуальна гэта пытанне стаіць для Еўразіі. Наш агульны кантынент павінен стаць прасторай міру і стабільнасці. Прыкладам устойлівага эканамічнага, сацыяльнага і гуманітарнага развіцця», — падкрэсліў расійскі лідар.

Прэзідэнт Расіі лічыць, што аснова для стварэння такой архітэктуры бяспекі ёсць. Паводле яго слоў, ёю могуць стаць ужо дзеючыя шматбаковыя формы супрацоўніцтва: Саюзная дзяржава, АДКБ, СНД, ШАС, БРІКС, АСЕАН і іншыя аўтарытэтныя і ўплывовыя структуры.

«У нашых краінах шмат робіцца для збераження праўды аб Вялікай Перамозе, у тым ліку пры змястоўным удзеле парламентарыяў», — адзначыў расійскі Прэзідэнт. У Саюзнай дзяржаве агульная работа павінна праводзіцца на пастаяннай і сістэмнай аснове. У сувязі з гэтым Уладзімір Пуцін прапанаваў стварыць пры Парламенцкім сходзе камісію па захаванні гістарычнай памяці. Паводле яго слоў, галоўнай задачай камісіі стане кансалідацыя грамадскіх і палітычных сіл, а таксама грамадзян вакол сумесных праектаў па абароне праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, Другой сусветнай вайне, подзвігах савецкага народа. У работу камісіі павінны быць уцягнуты і вядучыя эксперты, і гісторыкі нашых краін.

**Паводле БелТА.**

# «МЫ АБАРАНЯЕМ ПРАВА НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ ЖЫЦЬ У МІРЫ І ЗГОДЗЕ»

## Парламенцкая дэлегацыя — на форуме ў Валгаградзе



Фота БелТА.

**Правядзенне форуму ініцыявана Парламенцкім сходам Саюза Беларусі і Расіі і зацверджана Вышэйшым дзяржаўным саветам Саюзнай дзяржавы. Мерапрыемства, прымеркаванае да 80-годдзя Вялікай Перамогі, накіравана на абарону гістарычнай праўды і захаванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Беларускую парламенцкую дэлегацыю ўзначаліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, першы намеснік Старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Ігар СЕРГЯЕНКА.**

Падчас пленарнага пасяджэння Ігар Сергяенка адзначыў: «Мы ніколі не змірымся з пазіцыяй заходніх палітыкаў, апанаваных рэваншысцкімі памкненнямі, перапісаць гісторыю, абяліць нацысцкіх злачынцаў, іх памагатых». Ён падкрэсліў: ідэалогіямі калектыўнага Захаду на працягу дзесяцігоддзяў сістэмна і мэтанакіравана робіцца ўсё, каб падзяліць нашы народы, дыскрэдытаваць нашу агульную савецкую гісторыю. «Мы разумеем сутнасць гэтых спроб, — сказаў Ігар Сергяенка. — Паасобку мы не будзем народам-пераможцам. Нас хочуць аслабіць, забраць агульную гістарычную памяць, пазбавіць агульнай будучыні. Упэўнены, усе гэтыя намаганні не дасягнуць заяўленых мэт».

Як заўважыў спікер, гістарычная памяць накіравана не толькі ў мінулае, яна накіравана ў будучыню. «Менавіта таму ў Беларусі, па ініцыятыве грамадзян, у абноўленай Канстытуцыі замацаваны палажэнні аб абароне гістарычнай праўды і памяці аб подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — падкрэсліў Ігар Сергяенка. — Аналагічныя палажэнні адлюстраваны ў асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы, зацверджаных Дырэктывай Прэзідэнта. Прынятыя законы «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» і «Аб генацыдзе беларускага народа». У рамках крымінальнай справы па фактах генацыду беларускага народа Генеральнай пракуратурай устанаўліваюцца новыя сведчанні масавых распраў над мірным насельніцтвам, новыя населеныя пункты, якіх напаткаў страшны лёс Хатыні».

Па словах спікера, самае важнае — тое, што памяць аб вайне, якая закранула кожную беларускую сям'ю, застаецца ў нашых сэрцах. «Імёны герояў усіх нацыянальнасцяў ушанаваны ў назвах праспектаў і вуліц, — канкрэтызаваў ён. — Кожны абеліск, кожны помнік героям вайны беражліва захоўваецца, з'яўляецца месцам пакланення ўдзячных нашчадкаў. Памяць аб вайне мае яшчэ адно вымярэнне — захаванне міру, недапушчэнне паўтарэння трагічных памылак мінулага. Абараняючы праўду аб вайне, мы абараняем права нашых дзяцей жыць у міры і згодзе».

Пасля цырымоніі ўскладання беларускімі парламентарыямі вянкоў і кветак да Вечнага агню на Мамаевым кургане **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА** падкрэсліў: «Мы абавязаны захоўваць памяць аб подзвігу тых людзей, якія нягледзячы на вялізную еўрапейскую машыну, якую ўзначальвала фашысцкая Германія і якая прыйшла на нашу зямлю, знішчала нашы сёлы і гарады, дзяцей і маці, заводы і фабрыкі, рабілі ўсё, каб дасягнуць Перамогі».

Кажучы аб важнасці і значнасці міжнароднага форуму Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня», Сяргей Хаменка звярнуў увагу на тое, што сімвалізм гэтага мерапрыемства ў тым, што мы разам. «А калі мы адзіныя, мы ніколі непераможныя», — канстатаваў ён.

Меркаванні, выказаныя ўдзельнікамі форуму, будуць адлюстраваны ў заяве Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях абароны гістарычнай праўды, захавання гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў. Яе прынясце плануецца на 68-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая пройдзе ў чэрвені ў горадзе-героі Брэсце.

**Паводле БелТА.**

# ДАНІНА ПАВАГІ І ПАМЯЦІ

## Падчас візіту ў Ватыкан Ігар СЕРГЯЕНКА развітаўся з Папам Рымскім і ўшанаваў памяць барацьбітоў з фашызмам

Дэлегацыя на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў знаходзілася ў Ватыкане па даручэнні Прэзідэнта. На цырымоніі пахавання Папы Рымскага Францыска сабралася больш за 160 міжнародных дэлегацый, прыехалі лідары ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі, іншых краін. Развітацца з Пантыфікам прыйшлі звыш 250 тысяч чалавек.



Фота тэлеграм-канала Палаты прадстаўнікоў.

Як адзначыў, знаходзячыся ў Ватыкане, Ігар Сергяенка, ёсць каштоўнасці, якія вышэйшыя за любую палітыку, любую эканоміку. «Гэта міралюбнасць, справядлівасць, ісціна, дабрыня, — канкрэтызаваў спікер. — Ёсць людзі, якія кіруюцца гэтымі прынцыпамі ў сваім жыцці, сваёй дзейнасці. Ёсць рэдкія дзяржавы, якія ў сваёй палітыцы, эканоміцы выходзяць з гэтых прынцыпаў. Менавіта такой дзяржавай з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Па даручэнні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі мы прыбылі, каб ушанаваць памяць вялікага чалавека — Папы Рымскага Францыска, які ў сваім жыцці кіраваўся менавіта гэтымі прынцыпамі і шмат рабіў для таго, каб згуртаваць народы, каб правадзіць прынцыпы міралюбівай палітыкі ў жыццё, каб менш было канфліктаў, войнаў».

Акрамя таго, беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў усклала кветкі да брацкай магілы ў італьянскім горадзе Палестрына. Манумент узведзены ў гонар мясцовых жыхароў, якія гераічна змагаліся з нацызмам і фашызмам у перыяд Другой сусветнай вайны. Сярод выбітых на помніку імён — імёны трох чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з нямецкага палону і далучыліся да італьянскіх партызанаў. Імёны савецкіх воінаў — Мікалая Дзям'янчанкі, Анатоля Курэпіна і Васіля Скараходава — пазначаны на мармуровых скрыжалях, якія ахоўваюцца сумным анёлам. А мясцовыя жыхары з вуснаў у вусны перадаюць гісторыю іх барацьбы за агульную светлую будучыню і даглядаюць манумент.

«Мы прыехалі на гэтыя невялікія магілкі ў прадмесці Рыма, каб ускласці кветкі, аддаць даніну памяці італьянскім партызанам, якія загінулі за вызваленне сваёй краіны ад фашызму, — сказаў Ігар Сергяенка. — І ў складзе гэтых партызанскіх атрадаў ваявалі грамадзяне СССР. Тыя людзі, якія знаходзіліся ў палоне, уцяклі з палону, далучаліся, уступалі ў партызанскія атрады і ваявалі разам, плячо ў плячо. І сёння яны ляжаць разам на гэтых могілках. Мы прыехалі, каб ускласці кветкі і аддаць даніну памяці і павагі нашым суайчыннікам, якія загінулі на італьянскай зямлі».

Таксама адбылася сустрэча Ігара Сергяенкі з кіраўніком Камітэта салідарнасці з Беларуссю Матэа Педжо. Бакі абмеркавалі пытанні ўмацавання беларуска-італьянскіх гуманітарных і культурных сувязяў, захавання гістарычнай памяці. Мерапрыемства прайшло ў цёплай і сяброўскай атмасферы.

Таксама Ігар Сергяенка правёў сустрэчу з калектывам Пасольства Рэспублікі Беларусь у Італьянскай Рэспубліцы.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 12.05.2025.**

**Лот № 1 в составе:**
**1. Магазин «Универсам»**
(инв. № 200/D-168413), площадь – 2181,2 кв. м.
Земельный участок № 240100000003006430, 0,6563 га.
Право аренды. Срок действия с 12.05.2011 по 14.04.2110.
Адрес: Витебская обл., г. Витебск,
ул. Воинов-Интернационалистов, 11А-1.

**2. Трансформаторная подстанция**
(инв. № 200/С-82304), площадь – 47,0 кв. м.
Земельный участок № 240100000003006432, 0,0066 га.
Право аренды. Срок действия с 09.06.2011 по 15.04.2110.
Адрес: Витебская обл., г. Витебск,
ул. Воинов-Интернационалистов, д. 11Б.

Обременения: Аренда, Ипотека, Сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 2 268 416,00 долларов США.
Задаток – 699 284,60 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 07.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Дорстройиндустрия»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 21.05.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:** Погрузчик фронтальный одноковшовый Амкодор 342 «В»,
Заводской номер машины 3050157.
Адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь,
ул. Заводская, 1-1.
Начальная цена – 56 800,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 5 680,00 руб. Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 19.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(Организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Литвяны-Агро»** (Продавец)
проводит повторный открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ БАНИ**

**с инв. № 623/С-60963, общей площадью 192 м², расположенной на земельном участке с кадастровым номером 625684206001000265, площадью 0,1328 га (право аренды по 2072 г.), по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Литвяны, ул. Школьная, 8Е.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 690,24** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 369,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» 31.08.2023, 10.11.2023, 16.01.2024, 20.03.2024, 22.02.2025.

Аукцион состоится **19.05.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.05.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64; 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 882-76-94; 8 (01718) 60-3-72, 60-3-82.**
УНП 600002346

ТЭХНАЛОГІІ І ІНАВАЦЫІ

# ПАЛЯПШАЮЧЫ ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ МІЛЬЁНАЎ ЛЮДЗЕЙ

## Супрацоўніцтва беларускіх арганізацый з кітайскімі кампаніямі здольна стаць драйверам глабальных медыцынскіх інавацый



Агульнапрызнаны прынцып вяршэнства каштоўнасці чалавечага жыцця з'яўляецца краевугольным каменем цывілізацыі. Пра гэта заявіў намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК, выступаючы на Міжнародным форуме па медыцынскіх інавацыях і супрацоўніцтве — 2025, які прайшоў учора ў Кітаі, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

— Дзякуючы медыцыне мы перамаглі многія хваробы, якія раней лічыліся смяротнымі, навучыліся перасаджваць і нават штучна вырошчваць чалавечыя органы, падаўжаць і паляпшаць якасць чалавечага жыцця. А ключ да гэтага — медыцынскія інавацыі, бо менавіта яны дазваляюць нам рабіць немагчымае магчымым, — адзначыў у сваім выступленні профільны віцэ-прэм'ер.

Ён заўважыў: усе адчулі гэта, калі за лічаныя месяцы навукоўцы стварылі вакцыну супраць COVID-19.

— Сёння ва ўмовах глабалізацыі, калі выклікі аховы здароўя набываюць транснацыянальны характар, як ніколі актуальна правядзенне мерапрыемстваў, на якіх у прадстаўнікоў медыцынскіх колаў ёсць магчымасць падняць найважнейшыя пытанні, што стаяць перад сферай аховы здароўя, абмяняцца вопытам і разам знайсці шляхі вырашэння праблем, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

Што датычыцца двухбаковых адносін, узровень адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай адпавядае ўсепагоднаму і ўсебаковаму стратэгічнаму партнёрству, пераканаваны Уладзімір Каранік.

— З 2024 года Рэспубліка Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і прымае самы актыўны ўдзел у мерапрыемствах пад яе эгідай. Наша краіна праводзіць сумесныя з замежнымі партнёрамі даследаванні і распрацоўкі ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскага эканамічнага саюза, а цяпер і ШАС, пашырае праграмы акадэмічнай мабільнасці, актыўна прыцягвае замежных вытворцаў да супрацоўніцтва ў сферы лакалізацыі вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў і абсталявання, — паведаміў віцэ-прэм'ер.

Уладзімір Каранік падкрэсліў, што ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства — не проста словы:

— Яркім іх пацвярджэннем з'яўляецца той факт, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў 2023 годзе здзейсніў два візіты ў Кітайскую Народную Рэспубліку для правядзення асабістых сустрэч са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Па іх выніках кіраўнікі дзяржаў адзначылі развіццё супрацоўніцтва ў сферы аховы здароўя, медыцынскіх тэхналогій і фармацэўтыкі як адзін з асноўных стратэгічных кірункаў.

Профільны віцэ-прэм'ер канстатаваў той факт, што Беларусь настроена на актыўны дыялог з міжнароднымі партнёрамі ў галіне медыцыны і адкрыта да супрацоўніцтва.

— Вялікая ўвага ў нашай краіне ўдзяляецца традыцыйнай кітайскай медыцыне. У актыўнай стадыі прапрацоўкі знаходзіцца праект па стварэнні ў Беларусі рэгіянальнага цэнтра традыцыйнай кітайскай медыцыны, які, мы ўпэўнены, дазволіць зрабіць метады традыцыйнай кітайскай медыцыны даступнымі не толькі для беларускіх грамадзян, але і для грамадзян большай часткі Еўразійскага рэгіёна, — сказаў віцэ-прэм'ер.

Ён адзначыў, што зусім нядаўна ў Беларусі прайшоў юбілейны, 30-ты Міжнародны медыцынскі форум «Ахова здароўя Беларусі», які сабраў больш за 160 кампаній-удзельнікаў з васьмі краін. Актыўны ўдзел у форуме ўзялі і прадстаўнікі Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Уладзімір Каранік выказаў упэўненасць, што паглыбленне супрацоўніцтва беларускіх арганізацый з вядучымі кітайскімі кампаніямі ў галіне аховы здароўя здольна стаць драйверам глабальных медыцынскіх інавацый, паляпшаючы якасць жыцця мільёнаў людзей і ўмацоўваючы двухбаковыя адносіны.

Падчас візіту ў КНР Уладзімір Каранік правёў сустрэчу з намеснікам старшыні Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая Шэнь Юэюэ.

У СФЕРЫ АСАБЛІВАЙ УВАГІ

# МОЦ САДРУЖНАСЦІ

## У 2024 годзе ВУП дзяржаў — удзельніц СНД павялічыўся на 4,4 % у параўнанні з 2023-м



Гэты паказчык вышэйшы за тэмпы росту сусветнай эканомікі. Для падтрымання такіх высокіх тэмпаў развіцця эканомік краін СНД неабходна прадоўжыць рэалізацыю планаў. Гэта адзначыў намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Юрый ШУЛЕЙКА, выступаючы ўчора на пасяджэнні Эканамічнага савета СНД у Ташкенце.

Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што для падтрымання высокіх тэмпаў развіцця эканомік краін СНД неабходна працягваць эфектыўна рэалізоўваць намечаныя планы, перш за ўсё — Стратэгіі эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2030 года.

